Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# РАСЛІНЫ І ЖЫВЁЛЫ РОДНАГА КРАЮ
(гутарка)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Задачы: фарміраваць у дзяцей пачуццё патрыятызму і любові да малой Радзімы; прывіваць любоў да роднага сяла, выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды; развіваць звязную мову, лагічнае мысленне;

Матэрыял: карта Беларусі, дыдактычныя гульні «Наш лес», «Лес – наш дом», сілуэты дрэў, птушак, жывёл, малюнкі раслін.

Ход гутаркі:

Гучыць музыка…

Выхавальнік:

- Як называецца сяло ў якім мы жывём?

- Якія вы ведаеце гарады?

- Як называецца наша Радзіма?

Выхавальнік прапануе пагуляць у гульню «Рэха»

Выхавальнік:

- Мы жывем у … - Беларусі. Беларусь гэта наша …- Радзіма.. У кожнага яна адна. Мы тут нарадзіліся. Тут будзем вучыцца і працаваць. Нашы бабулі і дзядулі тут жывуць. Мы усе любім сваіх бацькоў. Мы любім свой садок, сваіх сяброў, сваю Радзіму.

- Чаму нашу Радзіму называюць сінявокай? Назавіце рэкі і азёры нашай краіны. ( возера Нарач, Сож, Буг, Нёман…)

- Выберыце тыя кветкі, якія растуць на нашых палях, лугах ( Дзеці выбіраюць карткі размешчаныя на сталах і выстаўляюць на дошку. (Гарлачык, васілёк, званочкі, ландыш, рамонак, першацвет..)

Выхавальнік:

-Што мы павінны рабіць, каб зберагчы багацце расліннага свету? Адказы дзяцей)

Выхавальнік загадвае загадкі:

Яно для нас усіх – добры друг,
Хоць дзіваком здаецца,
Што адзяе вясной кажух,
А у восень – раздзяецца. ( Дрэва)

Выхавальнік: якія дрэвы растуць у нашых лясах. ( На кожную загадку пасля адгадкі выстаўляюцца сілуэты дрэў)

І ў сто гадоў я малады,
Маё насенне – жалуды. ( Дуб)

Адна я ў лесе з белаю карой,
Паю вас сокам веснавой парой. ( бяроза)

Заўсёды – летам і зімой мае іголачкі са мной,
Галінак у мяне багата,
Зімой прыходжу да вас на свята. ( Ёлка)

Я зацвітаю кожным летам
Не пышным, ледзь прыкметным цветам.
Але як толькі зацвіту,

Дык пчолкі чуюць за вярсту. (Ліпа)

Ніштo не ляцела, ніштo не спужала,
А ўся затрымцела, а ўся задрыжала. ( Асіна)

Стаіць у лесе дрэўца,
Пад ветра лёгка гнецца.
А гронкі ягадак гараць,
І снегіры да іх ляцяць. (Рабіна)

- Дзеці, а як мы павінны шанаваць дрэвы? ( Дзеці адказваюць, выхавальнік паказвае забараняльныя знакі)

Выхавальнік: здагадайцеся, пра каго пойдзе гаворка: «Без страху і гора праляціць рэкі і мора»?

Так, гэта птушка. Прапануе выставіць на стойку птушак Беларусі.

Выхавальнік выстаўляе макет дрэва з гняздом, норкай, кустом. Праводзіцца дыдактычная гульня «Лес – наш дом» Пасля таго, як чарговая загадка адгадана, хто-небудзь з дзяцей размяшчае сілуэт адпаведнага звярка ў патрэбным месцы.

У дрэве – хатка, арэшкаў горка,
Гаспадыня тут… ( вавёрка)

Я прысела пад дубок,
А мяне кальнуў клубок( вожык)

Летам носіць ён кажух,
Уплятае мёд за двух ( мядзведзь)
Улетку шэранькі, узімку беленькі,
Доўгія вушкі мае, хутка ў лес уцякае. (заяц)
З грывай – не конь,
З рагамі – не бык,
З барадой – не казёл.
Гучна-гучна зароў
Цар пушчаных звяроў (зубр)

Выхавальнік:

- Малайцы. А якія яшчэ звяры жывуць у пушчы, але да нас не прыйшлі?

( Дзік, лось, казуля, алень, ..)

- Вось якое мноства звяроў водзіцца у нашых лясах. Гэта сапраўднае багацце, і мы павінны яго берагчы.

Усё, пра што мы з вамі гаварылі называецца адным прыгожым словам – прырода. Мы павінны яе любіць і шанаваць.

- Што вам больш за усё падабаецца ў беларускім лесе?
- Што расце на лугах, палях?
- Якая самая прыгожая птушка, што жыве на Беларусі?

Малайцы, дзеці!!! Як цудоўна ў нашай Беларусі!